*Л. П. Сівурава*

# ПРЫНЦЫПЫ СУЧАСНАГА АСВАЕННЯ АЎТЭНТЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

У сучаснай сацыякультурнай практыцы назіраецца актыўная дзейнасць па асваенні аўтэнтычнага фальклору. Тэрмін «*аўтэнтычнасць*» існуе для абазначэння першасных, традыцыйных, рэгіянальна-спецыфічных відаў культуры. *Фальклор аўтэнтычны* — гэта фальклор сапраўдны ў сваёй сутнасці і натуральным бытаванні, характэрны для канкрэтнай мясцовасці. Ён захоўвае ўсе свае спецыфічныя рэгіянальныя рысы, якія вызначаюцца рэгіянальнай традыцыяй; характарызуецца ўстойлівым жанравым складам, рэпертуарам, стылем, манерай выканання і г. д. Адарваны ад свайго асяроддзя, перанесены на сцэну або на іншую этнічную глебу, апрацаваны, ён губляе свае спецыфічныя якасці [1, с. 379].

Аўтэнтычны фальклор — гэта першакрыніца, асобная спецыфічная галіна духоўнай культуры, якая аб'ядноўвае ўсе віды творчай дзейнасці — славесную, музычную, народныя абрады, танец, народны тэатр, прыкладное мастацтва ў іх спрадвечным, адэкватным генетычным вытокам выглядзе. Ён функцыянуе ў натуральным асяроддзі, існуе як вусная традыцыя і праяўляе сябе як калектыўная свядомасць, псіхалагічна арыентаваная на непасрэдныя, нефармальныя зносіны. Прадстаўнікі аўтэнтычнай фальклорнай традыцыі — гэта, як правіла, мастакі-самародкі, спевакі, музыканты, танцоры, рамеснікі, а таксама сельскія фальклорныя калектывы, сямейныя ансамблі, якія адпавядаюць прыведзеным якасным характарыстыкам. Іх творчасць праяўляецца спантанна, без афіцыйнага староннягa ўмяшання [1, с. 9]. Калектыўны характар мастацкай творчасці фальклорных калектываў аўтэнтычнага тыпу і вусны спосаб перадачы твораў народнага мастацтва вядзе да *адсутнасці (незафіксаванасці) аўтарства*. Законамі натуральнага бытавання традыцыйнага мастацтва з'яўляюцца *самаарганізацыя, самарэгуляцыя і самакіраванне*.

Засваенне традыцыйных форм фальклору адбываецца ў дзейнасці калектываў *аўтэнтычных* і *набліжаных да аўтэнтыкі*. Калектывы *аўтэнтычнага* тыпу прадстаўлены носьбітамі пэўных рэгіянальных традыцый. Н*осьбітамі* фальклору з'яўляюцца асобы, якія генетычна звязаны з натуральным фальклорным асяроддзем пэўнай мясцовасці, атрымалі фальклорныя веды, творчыя ўменні ад сваіх папярэднікаў вусным шляхам і такім жа шляхам перадаюць іх наступным пакаленням [2, с. 18]. У рэпертуары калектываў аўтэнтычнага тыпу захоўваецца пэўная лакальна-рэгіянальная традыцыя. Для іх характэрная дыялектная форма выканальніцтва. Гэтыя калектывы генетычна звязаныя з народным бытавым музіцыраваннем, іх склад фарміруецца ў вясковым асяроддзі [3]. Функцыянаванне калектываў аўтэнтычнага тыпу адбываецца адначасова як у натуральных умовах бытавання, так і ў межах сцэнічнага выканальніцтва (фестывалі, конкурсы, этнаграфічныя канцэрты і г. д.).

У пачатку 1990-х гг. атрымаў развіццё *набліжаны да аўтэнтыкі* тып засваення фальклору. У аб'яднаннях пазначанага тыпу навучанне вядзецца вусным шляхам, наладжваюцца непасрэдныя стасункі з носьбітамі традыцыі, выкарыстоўваюцца фальклорныя першакрыніцы, вядзецца комплекснае вывучэнне гісторыі і культуры краю, адбываецца засваенне мікрарэгіянальных





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асаблівасцей музычнай, спеўнай, харэаграфічнай спадчыны, мастацкія ўзоры ўключаюцца ў побытавую практыку [3].

Аўтэнтычны фальклор з'яўляецца *культурай вуснага тыпу* са спецыфічнымі формамі бытавання і пераемнасці. Асноўным ***прынцыпам*** яго натуральнага бытавання ***з'яўляецца вуснае перайманне***. Засваенне ведаў і ўменняў у межах традыцыі ажыццяўлялася *шляхам назірання, капіравання, сумеснай дзейнасці майстра і вучня*. Міжпакаленная трансмісія праз вусны спосаб навучання ў этнапедагогіцы носіць назву *дэманстрацыйнай антрапатэхнікі*.

Прыярытэтам у навучальным працэсе павінна служыць забеспячэнне вуснага спосабу навучання. Пры свядомым падыходзе да пастаўленых задач стварэнне ўмоў для *вуснага* засваення ўзораў традыцыйнага мастацтва не ўяўляе цяжкасцей. Пры наяўнасці ў населеным пункце носьбітаў традыцый — спевакоў, танцораў, музыкантаў, майстроў па вырабе твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — менавіта ім належыць выконваць ролю транслятараў. Камунікацыя паміж майстрамі і вучнямі паслужыць добрым прыкладам засваення танцавальнай лексікі. Музыкант навучыць правільнай паставе рук пры ігры на музычным інструменце, адрэгулюе рытмічную і музычную пабудову твораў. Пры навучанні спеўнаму мастацтву немалаважным з'яўляецца назіранне за работай галасавога апарату, артыкуляцыйнай тэхнікі, капіраванне тэмброўкі голасу, рэгіянальна адметных спосабаў гуказдабывання.

Калі немагчыма арганізаваць індывідуальную работу «майстроў» з вучнямі, патрэбна карыстацца якаснымі аўдыё- і відэаматэрыяламі, запісанымі ад яркіх самабытных носьбітаў традыцый: спеўных калектываў і асобных выканаўцаў. Фона-, відэаархіў можа быць створаны кіраўніком самастойна, шляхам правядзення ім экспедыцыйнай работы. Бясспрэчная карысць такога падыходу ў тым, што даследчык паглыбляе асабістыя веды песенных, танцавальных традыцый мікрарэгіёна і мае шанс адкрыць новыя, дасюль недаследаваныя старонкі фальклорнай спадчыны, назапасіць невядомыя шырокаму колу аматараў творы.

Багатай крыніцай для засваення твораў народнага мастацтва могуць служыць матэрыялы, якія захоўваюцца ў раённых арганізацыйна-метадычных цэнтрах, фондах раённых музеяў, бібліятэк, архівах мясцовага і рэспубліканскага радыё, навукова-даследчых і вучэбных устаноў: Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вышэйшых педагагічных навучальных устаноў рэспублікі, прыватных архівах беларускіх этнамузыколагаў, этнографаў, удзельнікаў мастацкіх калектываў аналагічнага профілю.

***Прынцып прасторава-часавай лакалізацыі*** прадугледжвае наяўнасць пэўных лакальных зон правядзення абрадава-рытуальных дзеянняў, іх сталую прывязку да канкрэтнага месца ў прасторы (локуса) і часе — пары сутак, дня, тыдня, месяца, пары года. Напрыклад, абрад гукання вясны, які суправаджаецца спяваннем загукальных песень, ваджэннем карагодаў вакол вогнішча, гушканнем на арэлях, абрадавым частаваннем, танцамі і гульнямі адпаведнай пары году, праводзіцца на высокім месцы (узгорку) і пачынаецца ў поўдзень. Сігналам для абыходу двароў калядоўшчыкамі становіцца ўзыход першай вячэрняй зоркі. Дзявочы траецкі абрад кумлення павінен увасабляцца на ўскрайку бярозавага гаю альбо ў паркавай зоне. Сямейныя абрады не павінны пакідаць утульных сцен вясковай хаты.

У беларускай народнай традыцыі важнае месца ў натуральным бытаванні фальклору з'яўляўся ***прынцып каляндарнасці***, які стасуецца з прынцыпам

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

прасторава-часавай лакалізацыі. Уся культуратворчая дзейнасць соцыуму арганічна ўпісвалася ў прыродна-біялагічныя цыклы. Яе мэтай быў уплыў на прыроду, сацыяльнае асяроддзе, усталяванне гарманічных стасункаў з багамі і продкамі. Мэтазгодна захаваць гэты прынцып увасаблення твораў народнага мастацтва ў дзейнасці фальклорных калектываў.

Каляндарны прынцып выражаецца ў падборы рэпертуару. У залежнасці ад каляндарнага цыкла трэба напаўняць яго абрадава прымеркаванымі творамі. Так, з моманту выпадзення першага снегу неабходна пачынаць вывучэнне калядных песень, гульняў, мясцовых звычаяў адзначэння гэтага свята. У змест рэпетыцыйных заняткаў цікава будзе ўключыць выраб саламянага павука, маскі казы, аздабленне касцюмаў іншых персанажаў калядных святкаванняў. Напрыклад, падчас падрыхтоўкі і правядзення каляднай вечарыны «Ідуць, ідуць калядкі, вязуць бліны, аладкі» зручна наладзіць працэс пераемнасці, запрасіўшы ў калядную гасцёўню старажылаў, якія распавядуць пра старадаўнія звычаі калядных святкаванняў. Яны ўзгадаюць песні, якія спяваліся гаспадару, гаспадыні, дарослым сыну і дачцэ, малым дзеткам, «як зорачкам», падзеляцца сакрэтамі прыгатавання абрадавых страў. Паводле вывучанай традыцыі належыць скласці сцэнарый, размеркаваць ролі і правесці свята ў натуральным асяроддзі. Незабыўнымі ўражаннямі напоўніць духоўны свет дзяцей іх непасрэдны ўдзел у абрадавых хаджэннях пад вокны сяброў, знаёмых, сваякоў, настаўнікаў, якім папярэдне будзе паведамлена пра візіт калядоўшчыкаў, альбо ў малодшыя класы сваёй школы. Заслужанай падзякай за добрыя зычэнні, цудоўныя песні і гульнявое прадстаўленне з казою стануць салодкія пачастункі.

Аналагічным чынам належыць арганізоўваць вывучэнне веснавых, летніх, восеньскіх звычаяў, абрадаў і адпаведнага порам года музычнага, песеннага, танцавальнага фальклору. Адначасова з канцэртнымі формамі неабходна практыкаваць спосабы ўвядзення традыцыйнага народнага мастацтва ў побытавыя рэаліі сучаснага жыцця.

***Прынцып сінкрэтызму***. *Сінкрэтызм* — нерасчлянёнасць элементаў слова, музыкі, танца, пантамімы ў традыцыйных відах фальклору (абрадавыя дзеянні, карагоды, спеўныя і спеўна-размоўныя формы, якія суправаджаюцца ігрой на музычных інструментах, традыцыйная лірыка, раннія формы фальклорнага тэатра) [1, с. 308]. У дзейнасці асобных выканаўцаў і фальклорных калектываў аўтэнтычнага тыпу ў непарыўным адзінстве, спалучэнні і ўзаемадапаўненні знаходзяцца вуснае слова, мелодыя, рух і іншыя сродкі выразнасці. Належыць вывучаць і ўзнаўляць аўтэнтычны фальклор у непадзельнасці і нерасчлянёнасці розных складовых элементаў, формы, зместу, дзеяння, прасторава-часавых характарыстык і інш.

Фальклор аўтэнтычнага тыпу мае ярка выражаныя рэгіянальныя дыялектныя асаблівасці і спецыфічныя формы існавання. Адметнае спеўнае, музычнае, танцавальнае, інструментальнае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народны строй, яго каларыстыка, арнаментыка і г. д. уласціва кожнаму гісторыка-этнаграфічнаму рэгіёну Беларусі. У дзейнасці сучасных калектываў, якія за аснову сваёй творчасці абралі аўтэнтычны фальклор, павінен увасабляцца ***прынцып рэгіянальнасці***. Пажадана ўзнаўляць узоры народнага мастацтва пры захаванні дыялектных асаблівасцей маўлення, гуказдабывання, рытму, тэмбравых, лексічных асаблівасцей і інш.

Кіраўнікі фальклорных калектываў мусяць пастаянна паглыбляць свае веды, вывучаць рэгіянальную эстэтыку праз стасункі з носьбітамі народных традыцый, выкарыстоўваць фонды мясцовых этнаграфічных музеяў, звяртацца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да бібліяграфічных крыніц — рэпертуарных зборнікаў па рэгіянальным фальклоры, альбомаў народных строяў, матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый, наладжваць супрацоўніцтва з мясцовымі краязнаўцамі і ўстановамі адпаведнага профілю — дамамі і цэнтрамі рамёстваў і фальклору, весці кансультацыйную работу са спецыялістамі ў адпаведных галінах.

Адзін з галоўных у традыцыйнай народнай культуры — ***прынцып полаўзроставай дыферэнцыяцыі***. Кожнай асобе ўласцівыя статусныя сацыяльныя характарыстыкі, якія рэгламентуюць мадэль паводзін на побытавым і сакральна-рытуальным узроўнях. Абрадава-рытуальная практыка вызначае полаўзроставы склад удзельнікаў і іх ролі. У вясельнай абраднасці паміж удзельнікамі строга размеркаваны чыны і іх дзеянні (акцыянальны код). Так, радзінныя звычаі прадугледжваюць удзел жанчын з адпаведным сацыяльным статусам (замужніх, якія маюць дзяцей). Купальскі абрад прызначаны для дашлюбнай моладзі, шчадраванне — для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту. Заканамерна ўлічваць традыцыйны склад удзельнікаў абрадавых элементаў і адпаведным чынам размяркоўваць ролі.

***Прынцып уліку ўзроставых асаблівасцей выканаўцаў.*** Народная педагогіка грунтуецца на *адпаведнасці відаў заняткаў узроставым асаблівасцям дзяцей*. Для прыкладу, малодшыя школьнікі ў стане выконваць простыя рытмічна пабудаваныя музычныя творы з выкарыстаннем шумавых інструментаў, нескладаныя па малюнку і наборы рухаў побытавыя танцы, аднагалосныя спевы каляндарна-абрадавага рэпертуару, ім падабаецца лепка, выцінанка, выраб адзення для лялек. Для арганізацыі рухавай актыўнасці школьнікаў малодшага ўзросту падыходзяць гульні, якіх шмат назапашана ў скарбонцы побытавага пласта народнай культуры. Прыродзе малога дзіцяці адпавядае драматызаваная пабудова казачных сюжэтаў, у працэсе інсцэніроўкі якіх праяўляюцца творчыя здольнасці юнай асобы, яе ўнутраныя патрэбы ў пераўвасабленні. Уласцівыя зімовым (калядным) святкаванням элементы тэатралізацыі — карнавалізацыя, маскіраванне — дапамогуць узбагаціць і разнастаіць працэс мастацкага навучання.

Па меры сталення, фізічнага і разумовага развіцця дзеці здольныя засвойваць больш складаныя па форме і змесце ўзоры народнага мастацтва. Сямейнабытавая лірыка стане зразумелай дзецям толькі па дасягненні паўналецця. У працэсе паступовага развіцця музычнага слыху, а таксама галасавых даных яны здольныя да выканання шматгалосных спеваў з падводкай. Пераступіўшы парог падлеткавага ўзросту дзяўчынкі ў стане займацца вырабам і аздабленнем адзення, што звязана з фізіялагічнай асаблівасцю ўзросту — дастатковым развіццём мелкай маторыкі рук.

***Знакава-семантычны прынцып.*** Кожны элемент традыцыйнага народнага мастацтва (атрыбут, слова, мелодыя, рух, дзеянне, выява, арнамент, колер, абрадавая страва і інш.) носіць знакавы характар, ім уласціва пэўная семантыка. Важна ведаць гэтыя семантычныя значэнні і ў творчым пераўвасабленні першакрыніц не выходзіць за межы заданага семантычнага поля.

***Прынцып імправізацыйнасці.*** Выступленні фальклорных калектываў аўтэнтычнага тыпу маюць імправізацыйную аснову. Імправізацыйнасць — неад'емная частка творчага самавыражэння носьбітаў аўтэнтычнага фальклору і іх спадкаемцаў. Прастора індывідуальнай творчасці прадвызначаецца мясцовай традыцыяй.

Такім чынам, традыцыйная народная культура — культура вуснага тыпу, якая мае неад'емныя, спецыфічныя, уласцівыя толькі ёй прынцыпы жыццядзейнасці (калектыўнасць, вуснасць, рэгіянальная адментасць, інварыянтнасць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міфалагізм вобразаў і сюжэтаў, іх знакава-семантычны характар, прасторава-часавая лакалізацыя, полаўзроставая дыферэнцыяцыя, імправізацыйнасць, міжасобасная камунікацыя паміж носьбітамі, майстрамі і вучнямі ў працэсе мастацкай творчасці, абумоўленасць прыродна-біялагічнымі рытмамі і гаспадарчымі патрэбамі і інш.). Працэс асваення народнага мастацтва немагчымы без вывучэння своеасаблівасцей і заканамернасцей функцыянавання гэтага пласта культуры. Для слушнага асваення і далейшай трансляцыі неабходна наладжваць вусныя спосабы пераемнасці. Пісьмовы (безкантактны) шлях навучання непазбежна вядзе да парушэння законаў натуральнага існавання традыцыйнай культуры, уніфікацыі і спрашчэння яе ўзораў, эмацыянальнага выхалашчвання, фармалізацыі і нпіых негатыўных з'яў.

*Літаратура*

1. Восточно-славянский фольклор : Слов. науч. и нар. терминологии / редкол. : К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 478 с.

2. Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным гурце ў Рэспубліцы Беларусь // Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці / укл. Т. І. Стружэцкі. — Мінск : БелІПК, 1999. — С. 18—23.

3. *Сівурава, Л. П.* Фальклорныя калектывы / Л. П. Сівурава // Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : у 2-х т. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва — «Яшчур» / рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. — Мінск : БелЭн, 2006. — С. 667—668.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. І. Цітовіч